**Гагалінская Н.Л.**
ДУА "Міёрская сярэдняя школа № 3"
(РБ, Міёры)

# ТЭХНАЛОГІІ САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНАГА СУПРАВАДЖЭННЯ АДОРАНЫХ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

Адораныя дзеці- нацыянальнае багацце дзяржавы, аснова будучых поспехаў і залог росквіту грамадства. Вялікае задавальненне ад працы можа атрымаць і настаўнік, які своечасова выявіць і арганізуе працу з такімі вучнямі.

Лічу, што развіццю адоранасці спрыяюць праграмы для класаў з гуманітарным профілем і з паглыбленым вывучэннем прадметаў. Большая колькасць гадзін па беларускай мове і літаратуры дазваляе ахапіць і замацаваць значна большую колькасць вучэбнага матэрыялу, адвесці асобныя ўрокі на развіццё маўлення.

Існуюць <u>тры стратэгіі ў спецыялізацыі навучання адораных дзяцей</u>.

<u>Стратэгія паскарэння</u> дазваляе вылучыць шэраг канкрэтных форм:

<u>1.Паскарэнне ў звычайным класе</u>, якое звязана з арганізацыяй індывідуальнага навучання для некалькіх адораных вучняў. Гэта магчыма, калі яны могуць працаваць самастойна. Такую форму мэтазгодна выкарыстоўваць як у пачатковых, так і ў сярэдніх класах. Гэта зрабіць нескладана, таму што існуюць па кожнай тэме і рознаўзроўневыя заданні, і заданні павышанай цяжкасці, і займальны матэрыял. Думаю, што ў сярэднім звяне вельмі важна зацікавіць вучняў сваім прадметам, таму ў сваёй практыцы часта выкарыстоўваю гульні, гульнёвыя сітуацыі (напр., гульня "Снежны ком", "Што?Дзе? Калі?", "Шчаслівы выпадак"), заўсёды станоўча адношуся да тых вучняў, якія самі прыдумваюць гульні, складаюць крыжаванкі, малююць малюнкі да твораў, пішуць вершы ці празаічныя творы, умеюць адкрыта выказваць свае меркаванні.

<u>2. Заняткі па таму ці іншаму прадмету з вучнямі іншых (наступных) класаў</u>. Гэта форма работы патрабуе зладжанай работы некалькіх настаўнікаў. Лічу, што і гэтая форма мае права на існаванне, асабліва для вучняў сельскіх школ і вучняў, якія займаюцца ў класах з нізкай матывацыяй вучэбнай дзейнаці.

Репозиторий ВГУ

3. “Пераскакванне” праз клас . Вучня, які намнога пераўзыходзіць у здольнасцях сваіх аднакласнікаў, часта немагчыма адпаведна развіць пры ўмовах сумеснага з імі навучання. Таму перавод яго праз адзін ці два класы стварае ўмовы для заняткаў з большай хуткасцю і складанасцю матэрыялу.

4. Профільныя класы, калі адзін ці некалькі прадметаўвывучаюцца ў паскораным тэмпе і па больш складанай праграме. Такая форма паскарэння больш падыходзіць вучням з акрэсленай схільнасцю да той ці іншай галіны ведаў. Маю вопыт працы ў профільным класе з вывучэннем беларускай мовы і літаратуры, калі яшчэ набор адбываўся ў 8 класе. Безумоўна, праца ў такім класе мела свой плён: многія вучні паказалі высокі ўзровень ведаў па беларускай мове на ЦТ, адна вучаніца стала студэнткай філалагічнага факультэта ВДУ імя П.М.Машэрава, дзве- студэнткамі Мінскага педагагічнага ўніверсітэта, акрамя гэтага былі заваяваны прызавыя месцы ў раённых, абласных і нават у рэспубліканскай алімпіядах, у шматлікіх творчых конкурсах(гл. Дадатак).Але і пры арганізацыі профільных класаў прысутнічаюць адмоўныя бакі: дзеці часта ідуць у такія класы, каб не апынуцца сярод горшых і не трапіць у звычайны клас.Працуючы ў такім класе, яшчэ прыйшла да высновы, што і выхаваўчы працэс трэба будаваць у духу “беларускасці”, г. зн. старацца праводзіць як мага болей мерапрыемстваў, звязаных з культурай, традыцыямі, абрадамі беларускага народа.Мерапрыемствы, тыпу “Запалім зоркі памяці і надзеі”(прысвечаны Дню памяці продкаў),”Шлях Ефрасінні”,”Мой радавод”, спрыяюць фарміраванню жыццёвай пазіцыі вучняў.

5. Радыкальнае паскарэнне. Гэты метад шырока выкарыстоўваецца ў ЗША, дзе даказаў сваю эфектыўнасць пры навучанні дзяцей матэматыцы. Спецыяльныя праграмы па выбару прапануюцца вучням, пачынаючы з 7-8 класаў. У дальнейшым для найбольш адораных прадугледжваюцца заняткі па ўніверсітэцкай праграме. Яшчэ адзін шлях- прыватныя школы.

Паскарэнне тэмпу навучання спрыяе пазнавальнаму і асобаснаму росту адораных дзяцей, бо ў звычайным класе яны часта імкнуцца быць падобнымі да іншых, з-за чаго можа затрымацца развіццё. Але паскарэнне мае і некаторыя адмоўныя бакі. Трэба таксама ўлічваць, што паглыбленае вывучэнне толькі асобных прадметаў не спрыяе высокай агульнаадукацыйнай падрыхтоўцы. Адмоўным фактарам ў развіцці адораных дзяцей можа быць і недахоп зносін з равеснікамі, што негатыўна адбіваецца на іх эмацыянальнай сферы.

Стратэгія паглыблення, або ўзбагачэння, дае магчымасць адоранаму дзіцяці эмацыянальна развівацца ў асяроддзі равеснікаў, адначасова падтрымліваючы свае інтэлектуальныя здольнасці на належным узроўні. Гэтая стратэгія ўключае некалькі напрамкаў: пашырэнне кругагляду, паглыбленне ведаў аб навакольным асяроддзі, самапазнанне, развіццё інструментарыя атрымання ведаў. Важны праблемны падыход у навучанні, што азначае ўменне выявіць праблему, разгледзець розныя варыянты яе вырашэння і абагуліць усё знойдзенае. Прапануюць уключыць у навучанне і выхаванне адораных дзяцей сцэнарыі навучальных гульняў, практыкаванні для развіцця даследчыцкай і пошукавай актыўнасці. Праграмы, арыентаваныя на дадатковы і больш складаны матэрыял, могуць быць рэалізаваны праз заняткі на факультатывах, міні-курсах, у гуртках і да т.п. Так, РАА арганізоўвае міжшкольныя факультатывы па розных прадметах, заняткі там праходзяць і на працягу года, і могуць праходзіць у канікулярны час. З практыкі работы лічу, што такая форма дае магчымасць паспаборнічаць у ведах паміж таленавітымі вучнямі, паўтарыць, абагуліць і сістэматызаваць веды, падрыхтавацца да ўдзелу ў алімпіядах.Менавіта пры планаванні працы большую ўвагу звяртаю на выкананне алімпіядных заданняў па розных відах конкурсу, г.зн.

Рэпазіторый ВДУ

падрыхтоўка вядзецца і да лінгвістычнага конкурсу, і да водгуку, і да вуснага выказвання.

Стратэгія паскарэння і стратэгія паглыблення часта выкарыстоўваюцца ў спалучэнні і могуць пераходзіць адна ў другую ў залежнасці ад мэт навучання.

Трэцяя стратэгія з’яўляецца якасна іншай (напрыклад, развіццёвае навучанне Эльконіна- Давыдава).

У навучанні і выхаванні дзяцей першаступеннае значэнне мае асоба настаўніка. Па- першае, ён у поўнай меры павінен валодаць неабходнымі прафесійнымі ведамі, уменнямі і навыкамі. Па-другое, мець такія асобасныя якасці, якія неабходны ў зносінах з адоранымі вучнямі. Па-трэцяе, валодаць яшчэ і асаблівымі якасцямі, звязанымі з пэўным тыпам адоранасці: інтэлектуальнай, навуковай, мастацкай і інш. На сваіх уроках часта карыстаюся наступнымі тэхналогіямі: тэхналогіяй развіцця крытычнага мыслення, рознаўзроўневай тэхналогіяй, праблемнага навучання. Стараюся выбіраць такія формы і метады, якія б лепш дапамагалі вучням засвойваць матэрыял. Часта арганізую работу ў групах і парах, індывідуальную работу. Адораным дзецям даю магчымасць пабыць у ролі настаўніка. Напр., растлумачыць новую тэму, ацаніць работу іншых вучняў.

Рашаючым фактарам эфектыўнай дзейнасці настаўніка з’яўляецца яго сістэма поглядаў і перакананняў, у якой вялікую ролю адыгрываюць уяўленні аб самім сабе, іншых людзях, аб мэтах і задачах сваёй дзейнасці. Настаўнікі, якія ўнутрана трымаюць сябе, з большай лёгкасцю прымаюць іншых. А тыя, у кага нізкая самаацэнка, часцей адштурхоўваюць і іншых. Ніколі не імкнуся падаўляць індывідуальнасць вучня, але і накіраваць на правільны шлях лічу мэтазгодным. Мяркую, што паверыць у сябе мне дапамагла мая алімпіядніца Басікірская Алена, якая верыла ў нашу працу, у свае сілы і імкнулася наперад. Тры гады яна займала прызавыя месцы ў раёне і вобласці, у 2005 годзе стала пераможцай Рэспубліканскай алімпіяды (дыплом 3-яй ступені), а таксама пераможцай разнастайных творчых конкурсаў.Зараз яна студэнтка 5 курса завочнага аддзялення філалагічнага факультэта Мінскага педагагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, а таксама настаўніца беларускай мовы і літаратуры ў ДУА “Чарневіцкая сярэдняя школа”, мясцовая паэтка і член літаратурнага аб’яднання “Полоцкая ветвь”.

Адораныя вучні патрабуюць пільнай штодзённай увагі. Іх паводзіны часта неадэкватныя. Яны востра рэагуюць на няўдачы, таму трэба загадзя псіхалагічна рыхтаваць іх да станоўчага ўспрымання. Не кожны год вучням удаецца заваяваць прызавыя месцы на алімпіядах або творчых конкурсах, але не трэба спыняцца на дасягнутым і працягваць пільную працу. Такія вучні могуць зацыкліцца на сваёй праблеме, што можа прывесці да страты цікавасці да прадмета, а яшчэ горш- да пакушэння на жыццё. Вельмі важна заўважаць іх малейшыя дасягненні, поспехі, бо для іх галоўнае- быць у цэнтры ўвагі калектыва, міні-групы. Калі ж рабіць наадварот, то рэакцыя будзе негатыўная. Яны могуць пачаць ігнараваць вамі, старацца заваяваць увагу ўсялякім чынам, нават не захоўваючы свае абавязкі як вучня ( у плане дысцыплінаванасці). Нельга, без іх жадання, ставіць іх у рад, аб’ядноўваць у групы, пары з іншымі вучнямі. Заўсёды трэба адклікацца на іх просьбы. Таксама важна, каб такія дзеці мелі высокую самаацэнку, але ні ў якім разе не завышаную, бо тады ім будзе цяжка змірыцца са сваёй няўдачай і быць у павазе ў аднагодкаў.

У сваёй працы карыстаюся наступнымі рэкамендацыямі для работы з адоранымі дзецьмі:



Рэпазіторый ВГУ

1.Абапірацца на здольнасці, якія праяўляюцца ў дзіцяці ў дзейнасці.Важна правільна накіроўваць і развіваць дараванне. Так мае вучні цікавяцца журналістыкай, друкуюцца ў мясцовай газеце “Міёрскія навіны”, часопісе “Бярозка”і іншых выданнях, з’яўляюцца добрымі вядучымі. Таму заўсёды імкнуся ім дапамагчы ў гэтым, падтрымаць, даю магчымасць пісаць сцэнарыі розных мерапрыемстваў, уключаю іх у навукова-даследчую працу. Удалымі аказаліся навукова-даследчыя працы па тэмах: “Сучасныя паэты Міёршчыны”, “Паходжанне назваў паселішчаў Міёрскага раёна”,якія занялі 1-ыя месцы ў раёне.

2.Развіваць эмацыянальныя асаблівасці дзіцяці ў рабоце з заданнем, таму што гэта дае моцны штуршок для развіцця інтэлекту (вызначы настрой верша, карціны, песні, музычнага твора; апішы славесна партрэт героя твора, сябра; прыдумай мінорныя і мажорныя творы. Што ты адчуваеш, слухаючы гэту музыку? Ці падабаецца табе верш, казка, раман ?Чаму? Якую музыку можна падабраць да твора, карціны?)

3.Арганізоўваць кароткачасовыя назіранні за зменамі ў прыродзе (лістападам, снегападам, дрэвамі, кветкамі і інш.). Пры гэтым вучыць параўноўваць прадметы, з’явы, іх уласцівасці. Гэта будзе прывучаць дзяцей да дыферэнцыраванага ўспрымання і разумення сувязей паміж прадметамі рэчаіснасці, садзейнічаць развіццю разумовай актыўнасці дзіцяці.

4.Пабуджаць дзяцей да роздуму над рознымі з’явамі рэчаіснаці( Як патрэбна рэагаваць на зло? Які ўклад вы можаце ўнесці ў захаванне мовы, культуры беларускага народа? Якімі якасцямі павінен валодаць сапраўдны чалавек? І інш.). Вырашаючы такія праблемы, дзеці вучацца значна раней і глыбей разважаць над тымі пытаннямі, на якія адказаць самастойна поўнасцю яшчэ не могуць, паколькі не хапае ведаў і вопыту.

5.Практыкаваць заняткі па творчасці. Гэта можа быць і абарона праектаў, і літаратурныя чытанні, і вусныя выказванні па розных тэмах, і абарона саміх прэзентацый.

6.Мэтанакіравана падбіраць метады работы з дзецьмі, спецыяльныя арганізацыйныя формы; прадумваць змест, варыятыўныя прыёмы, якія б садзейнічалі праяўленню і развіццю здольнасцей выхаванцаў. Лічу, што патрэбны гадавыя індывідуальныя планы работы з адоранымі дзецьмі, і праца павінна весціся няспынна, уключаючы і канікулярны час. Змест праграмы па прадмеце павінен быць максімальна набліжаны да праграмы ВНУ. Акрамя сумеснай дзейнасці настаўніка і вучня, трэба арганізоўваць і самастойную работу дзіцяці( працу са слоўнікамі, дапаможнікамі, мастацкай і крытычнай літаратурай і т.п.).Пры гэтым неабходна весці кантроль за яе выкананнем, выяўляючы моцныя і слабыя бакі, весці асобныя сшыткі для падрыхтоўкі да алімпіяд, распрацоўваць тэмы вусных выказванняў, вучыць пісаць і карэкціраваць водгукі, выконваць разнастайныя заданні лінгвістычнага конкурсу.

Такім чынам, адораныя дзеці патрабуюць асаблівага да сябе падыходу, бо кожнае дзіця настолькі індывідуальнае і непаўторнае, што пытанне аб аптымальных умовах яго навучання павінна разглядацца з улікам канкрэтных сацыяльна-педагагічных і псіхалагічных умоў. Але ж менавіта ў духоўных зносінах заключаецца нешта незвычайнае, узаемнае, моцнае, тое, што ўражвае, робіць кантакт людзей незабыўным і прыводзіць да станоўчага выніку, да перамогі.

**Спіс літаратуры**

1. Рапацэвіч, Я.С. Разумовыя здольнасці: іх выяўленне і развіццё / Я.С. Рапацэвіч // Народная асвета. 1999. № 2,3,4,5



Репозиторий ВГУ

2. Бараева,Я.І. Псіхалагічная падрыхтоўка настаўніка да работы з адоранымі школьнікамі / Я.І.Бараева// Народная асвета. 2002.№2
3. Захожая, Н.М. Шматграннасць дзіцячай адоранасці / Н.М.Захожая // Народная асвета. 2002.№ 2
4. Каршакова, Ю.В. Сістэма адбору і падрыхтоўкі адораных дзяцей. Праграма "Адораныя дзеці" / Ю.В. Каршакова // Народная асвета. 2003.№ 12

Репозиторий ВГУ